Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, першапачаткова **Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў** — вышэйшая навучальная ўстанова ў Мінску, заснаваная ў 1948 годзе. Размешчаны па адрасе вул. Захарава, 21.

Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт



Заснаваны	1948
Рэктар	Наталля Яўгеньеўна Лапцева
Сайт	www.mslu.by (http://www.mslu.by)

Медыяфайлы на Вікісховішчы

Прапаноўвае для навучання англійскі, нямецкі, французскі, іспанскі (усе пералічаныя з'яўляюцца педагагічнымі), перакладчыцкі факультэты, факультэт міжнародных стасункаў і павышэння кваліфікацыі, факультэт рускай мовы для замежных грамадзян і факультэт па перападрыхтоўцы (усяго 9).

На базе ўніверсітэта дзейнічаюць 5 прафесійных асацыяцый: Беларускія асацыяцыі выкладчыкаў англійскай, французскай і нямецкай моў, Беларуская асацыяцыя камунікатыўнай лінгвістыкі, Беларуская асацыяцыя амерыканскіх даследаванняў.

Студэнты маюць шырокія магчымасці да творчасці. Так, напрыклад, студэнцкі хор «Cantus Juventae» існуе ўжо 15 гадоў. У рэпертуары — беларуская нацыянальная музыка, духоўныя песні, вядомыя творы беларускіх і замежных кампазітараў, джаз і інш. Хор выпусціў тры кампакт-дыскі са сваімі спевамі.

Некалькі гадоў існуе Французскі тэатр, які робіць пастаноўкі на французскай мове.

Ва ўніверсітэце дзейнічае таксама шэраг інфармацыйных цэнтраў (беларускай, іспанскай, турэцкай і кітайскай моў і культураў).

Гісторыя

Абвінавачванні ў палітычных рэпрэсіях

Паводле справаздачы, падрыхтаванай Польскім фондам свабоды і дэмакратыі, Наталля Баранава, рэктар універсітэта, адлічала студэнтаў за іх палітычную дзейнасць[1].

Падзеі 2020 года

Асноўны артыкул: ***Пратэсты ў Беларусі (2020)***

Пасля масавых фальсіфікацый на прэзідэнцкіх выбарах 2020 года, жорсткага разгону акцый пратэстаў, збіцця і катаванняў затрыманых пратэстоўцаў, студэнты ўніверсітэта ўзялі ўдзел у пратэстах 1-4 верасня. 4 верасня яны праспявалі англамоўную песню «Do You Hear The People Sing?» з фільма «Адрынутыя» ў холе навучальнай установы, трымаючы ў руках бела-чырвона-белы сцяг, у будынак уварваліся людзі ў цывільным і пачалі жорстка затрымліваць навучэнцаў[2].

9 верасня выкладчыкі МДЛУ ў адказ на жорсткія затрыманні запісалі відэазварот, у якім і падтрымалі студэнтаў і асудзілі дзеянні міліцыі і пазіцыю адміністрацыі ўніверсітэта, заклікалі прыцягнуць усіх вінаватых да адказнасці[2]. Сярод іншых у відэазвароце выступілі дацэнт Сяргей Карчыцкі, прафесары Алена Лукашанец, Вольга Судлянкова.

26 кастрычніка па закліку Святланы Ціханоўскай многія студэнты ўніверсітэта далучыліся да агульнанацыянальнай забастоўкі. Да страйку далучылася некалькі дзясяткаў выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта[3]. У гэты ж дзень у сацсетках з’явілася няпоўнае відэа, дзе дацэнт універсітэта Валерый Пішчыкаў, які паказваў сярэднія пальцы студэнтам. 27 кастрычніка Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў адлічваць усіх студэнтаў і звальняць выкладчыкаў, якія прымаюць удзел у несанкцыянаваных акцыях[4]. 29 кастрычніка з універсітэта звольнілі дацэнтку кафедры італьянскай мовы і актыўную ўдзельніцу страйкавага руху Наталлю Дуліну[5]. 30 кастрычніка ў знак салідарнасці з адлічанымі і звольненымі з універсітэта сышла прафесар Алена Лукашанец[6].

Дзеянні кіраўніцтва ўніверсітэта былі шырока асуджаныя на міжнародным узроўні[7]. У справаздачы «International Media Support», у прыватнасці, было адзначана, што «падзеі ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце паказваюць, як студэнты падвяргаюцца пагрозам і рэпрэсіям з боку сваіх уласных навучальных устаноў»[8].

Рэктары

- (1948—1961) — Міхаіл Фядотавіч Жаўрыд[9]
- (1961—1970) — Фрол Парфіравіч Шмыгаў
- (1970—1990) — Ніна Георгіеўна Краснова
- (1990—1995) — Уладзімір Васілевіч Макараў
- (1995—2020) — Наталля Пятроўна Баранава
- (з 2020) — Наталля Яўгеньеўна Лапцева

Выкладчыкі

- Таццяна Віктараўна Паплаўская
- Алена Уладзіміраўна Таболіч

Вядомыя выпускнікі

- Алесь Анціпенка
- Лявон Баршчэўскі
- Алена Грыцэнка
- Юрый Барысавіч Жалезка
- Зміцер Колас
- Уладзімір Колас
- Павел Латушка
- Уладзімір Макей

- Анатоль Майсеня
- Уладзімір Папковіч
- Яраслаў Раманчук
- Андрэй Саннікаў
- Уладзімір Чапега
- Вера Шпак
- Сяргей Шупа

Гл. таксама

- Лінгвагуманітарны каледж

Зноскі

1. Беларуская сістэма рэпрэсій. Перасьледнікі і іх ахвяры (http://web.archive.org/web/20131203002146/http://wid.org.pl/raport.pdf) = Białoruski system represji. Prześladowcy i ich ofiary / pod redakcją dr Dariusza Zalewskiego, Marka Bućko, Michała Kurkiewicza i Tomasza Pisuli. — Warszawa: Fundacja Wolność i Demokracja, 2007. — С. 41. — 72 с.
2. Выкладчыкі Лінгвістычнага ўніверсітэта запісалі зварот у падтрымку студэнтаў ВІДЭА (https://nashaniva.by/?c=ar&i=258710)
3. Некалькі дзясяткаў выкладчыкаў і супрацоўнікаў МДЛУ далучыліся да страйку, — дацэнтка кафедры (https://nashaniva.by/?c=ar&i=261438)
4. Лукашэнка запатрабаваў адлічваць і звальняць пратэстуючых студэнтаў, медыкаў, рабочых (https://nashaniva.by/?c=ar&i=261389)
5. З МДЛУ звальняюць дацэнтку кафедры італьянскай мовы і актывістку забастоўкі (https://eurora dio.pl/z-mdlu-zvalnyayuc-dacentku-kafedry-italyanskay-movy-i-aktyvistku-zabastouki)
6. В Минске задержана уволенная преподаватель МГЛУ. 30.10.2020 (http://www.afn.by/news/i/282804)
7. 2020-10-20 Minsk State Linguistic University, Belarusian State University of Culture and Arts, Brest State Technical University (https://www.scholarsatrisk.org/report/2020-10-20-minsk-state-linguistic-university-belarusian-state-university-of-culture-and-arts-brest-state-technical-university/) (англ.). Scholars at Risk. Праверана 17 снежня 2020.
8. Students in Belarus stand up against repression (https://www.mediasupport.org/blogpost/students-in-belarus-stand-up-against-repression/). International Media Support. Праверана 17 снежня 2020.
9. https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/220996/1/2798-1.jpg

Літаратура

- Мі́нскі лінгвісты́чны ўніверсітэт // Беларусь: энцыклапедычны даведнік / Рэдкал. Б. І. Сачанка (гал. рэд.) і інш.; Маст. М. В. Драко, А. М. Хількевіч. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 492—493. — 800 с. — 5 000 экз. — ISBN 985-11-0026-9.
- Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 10: Малайзія — Мугаджары / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. — Мн. : БелЭн, 2000. — Т. 10. — С. 444. — 10 000 экз. — ISBN 985-11-0035-8. — ISBN 985-11-0169-9 (т. 10).

Спасылкі

- Афіцыйны сайт МДЛУ (http://mslu.by) (руск.)

Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт (https://commons.wikimedia.org/wiki/Category:Minsk_State_Linguistic_University?uselang=be) на Вікісховішчы

- Выпускники переводческого факультета Минского иняза (http://in.1963.ru/index.html)
  Архівавана (https://web.archive.org/web/20090218193134/http://in.1963.ru/index.html) 18 лютага 2009. (руск.)
- Студэнцкае жыццё МДЛУ анляйн (http://mslulive.com)
  Архівавана (https://web.archive.org/web/20151121134307/http://mslulive.com/) 21 лістапада 2015. (руск.)

Установы вышэйшай адукацыі Беларусі [паказаць]	
У сацыяльных сетках	LinkedIn (https://www.linkedin.com/company/minsk-state-linguistic-university/)
Фота, відэа і аўдыё	Instagram (https://instagram.com/profmslu)
Нарматыўны кантроль	ISNI: 0000 0001 2207 3081 (http://isni-url.oclc.nl/isni/0000000122073081) · LCCN: no97012123 (http://id.loc.gov/authorities/no97012123) · VIAF: 157370210 (http://viaf.org/viaf/157370210) · БАП: 147393 (https://bis.nlb.by/by/documents/147393) · WorldCat VIAF: 157370210 (https://www.worldcat.org/identities/containsVIAFID/157370210)

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Мінскі_дзяржаўны_лінгвістычны_ўніверсітэт&oldid=4439199"